**Паліна Кунахавец**

# Што пасееш, тое і пажнеш

На мора ў гэтым годзе мае бацькі не рашыліся ехаць. Каранавірус, лета ў чэрвені спякотнае, а ў жніўні дажджлівае, таму сядзелі мы больш дома: чыталі кнігі, газеты. Часам бацькі дазвалялі пасядзець ў інтэрнэце. Вечарамі дапамагалі на агародзе: палолі градкі, палівалі агуркі і памідоры, збіралі ўраджай.

У сярэдзіне жніўня ў цёткі Галіны юбілей, пяцьдзясят пяць гадоў. Цётка жыве ў Мінску, на вуліцы Максіма Багдановіча, недалёка ад тэатра оперы і балета. І мы вырашылі на некалькі дзён паехаць да Галіны Іванаўны. Па-першае, цётку мы вельмі любім і паважаем. Па-другое, Мінск – прыгожы горад і мы з задавальненнем гуляем па вуліцах нашай сталіцы, наведваем музеі, тэатры, кінатэатры, паркі і скверы.

Так як цётка працуе экскурсаводам і жыве на вуліцы Багдановіча, то я папрасіла расказаць што-небудзь цікавае з жыцця вядомага паэта. Нам настаўніца ў школе расказвала, што Максім Багдановіч сябраваў з пісьменнікам Змітраком Бядулем, а калі прыязджаў у Мінск, то спыняўся не ў гасцініцы, а на кватэры ў Змітрака Бядулі. Галіна Іванаўна з радасцю, але немнагаслоўна расказала нам пра Багдановіча, а вось пра Змітрака Бядулю расказала цэлы аповед.

Аказваецца, што стрыечная бабуля маёй цёткі Марыя Ягораўна Змітрака Бядулю ведала асабіста. Адукаваны яўрэй, выхаваны на слове жывога Бога, часта паўтараў словы з Евангелля: “Што пасее чалавек, тое і пажне”.

І тут я ўспомніла, як ў сёмым класе мы чыталі апавяданне Змітрака Бядулі “На каляды к сыну”. У творы аўтар паказаў, як Лаўрук усё болей і болей аддаляўся ад сваіх бацькоў. Маці, старая Тэкля, слепа радавалася, фанабэрылася перад суседзямі: “Які сын вырас!..” А Лаўруку ўжо брыдка было ўспамінаць пра сваё паходжанне, ён зусім не збіраецца дапамагаць сваім родным. Лаўрук, чэрствы, пазбаўлены сумлення, вернасці, удзячнасці, а самае галоўнае – чалавечнасці, выганяе з дому стомленую, галодную маці. Чаму сын так зрабіў? Ён што – здраднік, з чорнаю душой, чэрствым сэрцам? Мяне, калі я прачытала апавяданне, моцна цікавіла адно пытанне: “Чаму Змітрок Бядуля не напісаў, а што будзе далей? Ці пашкадаваў Лаўрук пра свой учынак?”

І я задала гэтае пытанне Галіне Іванаўне. Тая некаторы час памаўчала, а потым амаль прашаптала: “Нам тыя вяртаюцца кветкі, што самі сабе ўзгадавалі”. Я не зразумела, што цётка гэтым хоча сказаць.

Тады Галіна Іванаўна пачала ўспамінаць, што ёй расказвала Марыя Ягораўна.

Лаўрук жыў у багацці, раскошы: вялікі дом, дарагая мэбля, мяккія дываны, смачная ежа, многа слуг, а ў сэрцы няма міру, няма радасці, пастаянная незадаволенасць жыццём. Нарадзіўся сын, Сцяпан, а бацька не можа нічым добрым падзяліцца, бо ўнутры ён, на вялікі жаль, пусты. А пустыя мяшкі не стаяць. Сярод зла цяжка выгадаваць добрага чалавека. У сям'і павінен быць прыклад адносін паміж мужам і жонкай. Нехта з вядомых гаварыў, што дзяцей можна не выхоўваць, бо яны ўсё роўна будуць такія, як іх бацькі.

Сцяпан рос ціхім, раўнадушным, абыякавым. Бацьку не паважаў, з аднакласнікамі не сябраваў. Вучоба хлопцу давалася цяжка. Ён амаль нічога не ведаў пра бабулю і дзядулю па бацькоўскай лініі. У той год, калі Сцяпана прызвалі ў армію, на сухоты захварэў бацька [Лаўрэнцій], а праз два гады (зусім яшчэ малады) памёр. Хлопец нядоўга сумаваў па бацьку, ажаніўся, уладкаваўся на працу ў дэпо. А за пару дзён да нараджэння сына Івана пачалася Вялікая Айчынная вайна. У час вайны Сцяпан папаў у акружэнне, быў паранены ў нагу. Тры гады ў нямецкім лагеры смерці, а потым дзесяць гадоў у савецкіх лагерах. Толькі, калі Івану споўнілася пятнаццаць гадоў, цяжка хворы Сцяпан прыйшоў дахаты. Дома бедна, халадна, але ёсць і вялікая радасць. Сцяпан у сваім сыне ўбачыў бацьку. Іван вырас знешне прыгожым, разумным. Паступіў у інстытут, вучыўся на факультэце гісторыі і права. Калі Іван быў на трэцім курсе, ад запалення лёгкіх бацька памёр. Жонка Сцяпана Алеся прывыкла да нягод, бяды, прывыкла яна і да таго, што трэба жыць у кожным дні. Пасля смерці мужа адзіная ў яе радасць была – сын Іван. А Іван паспяхова закончыў інстытут, уладкаваўся на харошую работу, ажаніўся. У трыццаць пяць гадоў ён ужо працаваў у міністэрстве. Сваёй сям'ёй Іван мала цікавіўся, а пра маці і зусім забыў. Праз пяць гадоў Алеся Пятроўна даведалася, што яе сын трагічна загінуў.

Жанчына пастарэла, пачала часта хварэць. Пенсія малая, таму Алеся Пятроўна вырашыла ўзяць на кватэру дзяўчыну – студэнтку педінстытута – Ніну. Дзяўчынка ласкавая, добрая, разумная. Ніна на летніх канікулах паехала на фальклорную практыку. У вёсцы, куды прыехала дзяўчына, амаль палова жыхароў мела такое ж прозвішча, як і ў Алесі Пятроўны. Ніну цікавілі легенды і паданні. І тут адзін дзевяностагадовы дзед расказаў , што ў іх вёсцы быў такі выпадак, калі сын маці сваю не прызнаў перад слугамі. Адрокся, зусім адрокся ад яе. Ніна гэтую легенду расказала Алесі Пятроўне. Тады бабуля вырашыла знайсці свайго ўнука,сына Івана, і расказаць яму ўсё пра сына, мужа, свёкра. Унук зразумеў, чаму ў сям'і ўсе мужчыны паміралі маладымі, і

вырашыў клопат пра бабулю ўзяць на сябе. Толькі такім чынам ён спыніў пракляцце.

Пасля аповеду цёткі Галіны мне захацелася пабыць адной. Цэлы вечар я думала аб тым, што не толькі ў фізічным свеце бывае, што пасее чалавек, тое ён і пажне. Закон гэты дзейнічае і ў духоўным. Для сябе я вырашыла жыць так, каб за мае ўчынкі не плацілі мае ні дзеці, ні ўнукі, ні праўнукі.

А раніцай я падышла да сваіх бацькоў і сказала, што моцна-моцна іх люблю.